ДУА»Граўжышкоўскі яслі-сад-базавая школа»

Выпуск 1

верасень

# Школьны веснік

## Старасць-гэта мудрасць

Наша старэйшае пакаленне. Гэта людзі, у якіх за плячамі доўгае, дастойнае жыццё. Многія з іх і сёння працуюць. Мы высока цэнім уклад, які ўносілі і ўносяць пажылыя людзі ва ўмацаванне дабрабыту нашай Беларусі. Прэзідэнт, урад, кіраўніцтва раёнаў робяць усё магчымае для паляпшэння жыцця ветэранаў. Ад гэтай справы ніхто не павінен стаяць у баку, неабходна ўсім помніць пра клопаты і патрэбы пажылых людзей, праяўляць да іх увагу і міласэрнасць, паўней выкарыстоўваць іх багаты вопыт, веды, духоўны патэнцыял.

Я ганаруся тым што з намі жыве прабабуля, ёй 86 год .Яна нарадзілась у 1928 годзе ў вёсцы Вайшнарышкі. У бабулі было 5 дзяцей: 3 сыны і 2 дачкі. Мая бабуля была вельмі працавітая. Яна працавала даяркай . Бабуля ўмее пісаць і чытаць па- польску і па- рускі . Я сваю прабабулю вельмі люблю. Яна добрая , мілая, сардэчная, вельмі любіць сваіх праўнукаў.

Яна яшчэ дапамагае маме мыць посуд , падмятаць падлогу , паліваць кветкі , варыць бульбу курам .

Напярэдадні свята, я жадаю сваёй прабабулі моцнага здароўя, даўгалецця, аптымізму, бадзёрасці духу, шчасця і сардэчнай цеплыні!

***Васілеўская Н.***



**Ястрэмская Марыя Клеменцьеўна**

### *Віншуем ветэранаў*

Шаноўныя ветэраны !

Прыміце самыя шчырыя віншаванні з Міжнародным днём пажылых людзей!

Людзі старэйшага пакалення–гэта крыніца мудрасці, важных ведаў і жыццёвага вопыту.Яны пе -радаюць сваім дзецям, унукам і праўнукам лепшыя сямейныя традыцыі і духоўныя каштоўнасці.

Клопат пра людзей старэйшага пакалення, стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць дастойнае жыццё ветэранаў, — святы абавязак кожнага з нас.

Паважаныя пенсіянеры-настаўнікі, ветэраны працы! Прыміце словы падзякі за шматгадовую працу, любоў да роднай зямлі, актыўную жыццёвую пазіцыю.

Жадаем вам моцнага здароўя, даўгалецця, аптымізму, бадзёрасці духу, шчасця і сардэчнай цеплыні!

***Вашыя ўдзячныя вучні***

# Дружная сям'я



***Сям'я – гэта тое, што дзеляць на ўсіх,***
***І тое, што ўсіх яднае,***
***Здаровых і хворых, старых і малых,***
***У повязь адну злучае.***

Таемны сімвал жыцця – сям'я!
Бы кропелька ў моры Айчыны.
А ў кропельцы гэтай – ты і я,
Дзеці, мужчыны, жанчыны…
У кропельцы гэтай – родны падворак,
Рэчка ля гаю, лясны ўзгорак,
І сцежка, якая вядзе да хаты,
Да рук цеплыні, да матулі і таты.
Сям'я – гэта клопат, заўжды ўзаемны,

Сям'я – маленькая радзіма, маленькі свет, які заўсёды побач. Нават калі родныя табе людзі далёка, ты ўсё роўна адчуваеш іх клопат, увагу, ты ведаеш, што ёсць людзі, якім ты не абыякавы, людзі, якія прыйдуць да цябе на дапамогу, а парада родных будзе заўсёды шчырай і карыснай.
Калі нараджаецца чалавек, разам з вялізным светам, разам з жыццём ён набывае сям'ю. Нарадзіцца ў сям'і, сярод блізкіх, тых, хто любяць цябе людзей – гэта велізарнае шчасце. Толькі ў сям'і можна здабыць упэўненасць, спакой, толькі родныя людзі заўсёды зразумеюць цябе, падтрымаюць, даруюць. Дзеля сваёй сям'і чалавек здольны на подзвіг, абараняючы сваё дзіця, маці, не раздумваючы, ідзе на смерць, дзеля маці або бацькі дзіця можа ахвяра-ваць сваімі жадання-мі.Сёння, напярэдад-ні свята маці,я хачу расказаць пра сваю сям'ю. Яна ў нас мна-гадзетная. Спачатку мы жылі ў вёцы Лойці.У 2010 наша дружная сям'я пераехала ў агр. Граўжышкі.Мы пазнаёміліся з новымі суседзямі і здружыліся.Сям'я наша вельмі дружная і вясёлая, нам вельмі цікава разам.Мой тата працуе ў ОАО «Сырадзельны завод" , а мама ў школе ўборшчыцай. Яна зараз у дэкрэтным водпуску.У мяне чатыры сястрычкі:Віка,Дар'я ,Вераніка,Лізавета. Я, Віка і Даша вучымся ў школе.Мне адзінаццаць год.Я люблю, калі ў мяне добрыя адзнакі, таму што разам са мною радуецца тады мама і тата. Мая сястрычка Віка любіць заводзіць новых сяброў. Даша вучыцца ў трэцім класе.Вельмі любіць матэматыку,а таксама прыгожа спявае. Мы дапамагаем мату-лі прыбіраць кватэру, нянчым малодшых сястрычак, гатуем з мамай смачныя стравы. Вераніка і Лізавета яшчэ маленькія. Ім падабаецца гуляць з цацкамі.

Летам мы часта ўсёй сям'ёй ходзім у лес на шашлык, збіраем ягады і грыбы.

Мы любім, калі да нас прыязджаюць бабулі і дзядуля. Мець вялікую сям'ю - гэта вельмі добра.

Вось так і жывем. Мы моцная сям'я. Ніякае гора не ўвойдзе ў наш дом, таму што дзверы адчыненыя для дабра, поспеху, кахання, шчасця. Я хачу, каб усе сем'і жылі так, як мы. Прыходзьце да нас у госці, дзверы нашай хаты заўсёды адчынены для добрых людзей.

***Дзіяна Відзевіч, вучаніца 6 класа***

Сям'я – гэта хлеба водар прыемны,
Штодзённа – і праца, і адпачынак,
Сям'я – твой надзейны ў жыцці прыпынак,
Куды б ні звялі цябе лёсу дарогі,
Шукай ты найперш у сям'і дапамогі,
Бо тая душа, тое сэрца багата,
Дзе вечна жывуць словы "мама" і "тата".

## Любая мама



Маю маму завуць Тэрэса.Яна працуе даяркай на ферме і сочыць , каб каровы былі падоены, цяляты накормлены і здаровыя.У выхадны дзень яна прыбірае ў хаце, пячэ розныя прысмакі і смачныя пірагі.На новы год мама была вельмі прыгожай. Мама стараецца, каб мы былі акуратныя . Яна вельмі любіць нас. Яна ніколі не крычыць.Мы стараемся дапамагаць матулі па гаспадарцы, мыць посуд, прыбіраць у хаце.

Я хачу, каб мая мама заўсёды была радасная і шчаслівая, каб на яе твары ніколі не было слёз, а яшчэ я хачу , каб мама жыла доўга і ніколі не хварэла.

Са святам, Днём Маці, мая мілая мама!

**М.Дзятловіч**

***Цеплынёй атуліць***
***Сонейка зямлю.***
***Мілая матуля,***
***Я цябе люблю.***

## Мая пяшчотная...

Прыгожае слова матуля. Ах колькі ў ім цеплыні і кахання. Маці – твой вобраз не забыць за стагоддзі, а голас твой пяшчотны будзе заўсёды самым дарагім і мілым. Як добра, што ёсць маці, ёсць да каго прыйсці, прытуліцца, абняць, паплакаць…. Самым цудоўным словам у любой краіне, на любой мове з'яўляецца слова – мама. Пра маму можна казаць бясконца. Пра яе прыгожыя вочы, залатыя рукі і добры характар. Для кожнага дзіцяці маці з'яўляецца сэнсам яго жыцця. І якой бы маці не была , для свайго дзіцяці яна назаўжды застанецца самай прыгожай і каханай.

Мая мама самая лепшая на свеце. Яна вельмі прыгожая, заўсёды акуратная, стройная. Мама- добрая гаспадыня. Яна стараецца , каб у нас у хаце заўсёды было чыста і акуратна, а як смачна мамы гатуе ежу. Яна не толькі добрая мама, але і добрая жонка. Мама працуе у краме. Гэта нялёгкая праца. Цэлы дзень трэба прастаяць на нагах, і не проста прастаяць, а культурна абслужыць сваіх пакупнікоў, каб яны былі задаволены і зноў прыйшлі у краму. А яшчэ яна кожны раз хвалюецца за нас з сястрычкай, каб мы добра вучыліся, каб былі дагледжаныя, накормленыя, апранутыя.

Маці – падарыла мне з сястрычкай жыццё, перажывае з намі ўсе трывогі і радасці. У самы цяжкі час яна заўжды разам з намі. У любую хвіліну яна сэрцам і душою з намі. Як прыемна пачуць у тэлефоннай трубцы яе ветлівы голас, пачуць усю цеплыню і пяшчоту, якая ідзе ад яе сэрца. І заўсёды, у любым узросце я буду кахаць сваю матулю і буду заўжды ёй дапамагаць.



– Дзякую, маці, за чуласць, дзякую за дабрыню, дзякую за жыццё…. Ніхто акрамя цябе так не разумее нас як ты. А колькі начэй ты не дасыпала, не заплюшчвала вачэй. Паклон табе, матуля, нізкі паклон. Жыві даражэнькая доўга, як і далей дары цеплыню і пяшчоту. Не крыўдзіце, дзеці, сваіх матуль, беражыце іх!

**Яна Кашчыц , вучаніца 6 класа**

# Ёсць на зямлі прафесія ад бога




У гэты кастрычніцкі дзень звычайна хораша і ўрачыста на душы ў педагогаў, іх вучняў, бацькоў… Нават у тых, для каго шумлівыя школьныя гады засталіся далёка ў мінулым. Бо такое ўжо гэта свята — Дзень настаўніка: мае адносіны да ўсіх і кожнага. І няхай сабе не ўсе яго адзначаюць, не ўсе віншуюць ці прымаюць віншаванні, але ці не кожны ў гэты дзень прыгадвае родную школу і любімых педагогаў. І хаця афіцыйна яго дата прыпадае на першую нядзелю кастрычніка, звычайна ўсе ўрачыстасці і святочныя мерапрыемствы ладзяцца ў суботу.

За што звычайна дзякуюць педагогам? За навуку, за дапамогу ў абранні жыццёвага шляху, за цікавыя пазакласныя мерапрыемствы… А найчасцей — за цеплыню душы, неабыякавае стаўленне да дзяцей, іх праблем, турбот, іх лёсаў… За тое, што не вызначыш словамі, не запішаш лічбамі… Яно, тое няўлоўна-прыемнае, значнае, застаецца ў сэрцах выхаванцаў. Надоўга, а то і назаўсёды.

Праўда, ацаніць ролю педагогаў ва ўласным жыцці здольныя найперш тыя колішнія школьнікі, якія ўжо самі сталі дарослымі, стварылі ўласныя сем'і, прывялі дзяцей у школу…

Што ўжо казаць пра тых выпускнікоў, якія абралі настаўніцкую прафесію… Літаральна з першых дзён працы яны нарэшце пачынаюць разумець сваіх педагогаў, пераймаць іх стыль, метады, прыёмы.

Словам, наўрад ці хто будзе спрачацца з тым, што педагог — прафесія складаная, шматгранная, якая патрабуе пастаяннага творчага гарэння, самаўдасканалення, душэўных сіл і намаганняў, якая забірае амаль увесь вольны час. Затое ва ўзнагароду — мяккае святло чыстых дзіцячых вачэй, даверлівасць, цеплыня, удзячныя словы выпускнікоў. І — задаволенасць вынікамі сваёй працы, усведамленне правільнасці абранай прафесіі, якая столькі дае душы і сэрцу.

Са святам вас, шаноўныя педагогі, дарагія нашы настаўнікі і выхавальнікі! Самыя шчырыя віншаванні — тым, хто сёння працуе, і тым, хто знаходзіцца на заслужаным адпачынку. Бо настаўнікі, як вядома, былымі не бываюць.

Моцнага вам здароўя, шаноўныя нашы, пабольш нагод для радасці не толькі ў святы, але і ў будні, задавальнення ад зробленага, удзячнасці ад вучняў і выхаванцаў, шанавання ад іх бацькоў, разумення і падтрымкі ад калег і толькі сонечных дзён у жыцці.

***Выпускніца школы***

***Булкевіч Н.***

## З Днём настаўніка

Калі ўжо лёс наканаваў
Настаўнічаць у школе,
Жадаю – каб не сумаваў
Ніхто з вас тут ніколі.
Расціце парасткі святла,
Хай родзіць ваш палетак.
Удачы творчай вам, цяпла,
Удзячнасці ад дзетак.
Заўжды каб хлеб быў на стале,
Было й да хлеба штосьці.
І каб – хацелася й далей
Служыць дабру і прыгажосці.




### *Настаўнік*

На роспач не маеш права,
Хаваеш слабасць і стому.
Твая нялёгкая справа
Жыццё адкрываць другому.

Любові навучыць адданай
Да роднай пявучай мовы,
Што з песні жытоў саткана,
Са звону гусляў вясновых.

Любові да роднага краю,
Да песень і казак матулі,
Сівых курганоў ля гаю,
Дзе мудрыя продкі паснулі.

У працы не маеш права:
На роспач,
на слабасць,
На стому.
Твая пачэсная справа —
Жыццё адкрываць другому.

### *Настаўніку*

Стаяць ля маладых гадоў,
Ля чалавечага дзяцінства —
Вялікі гонар, светлы доўг
Настаўніцтва і мацярынства.

Спачатку ў сэрцах прабудзі
Цягу і смагу да асветы,
Пасля — задуманых вядзі
Аж да крыніцы чыстай, светлай.

На ростані шляхоў-дарог,
Абвеяных паходным пылам,
Народ навекі нам збярог
Крыніцу мудрасці і сілы.

Ты чэрпаць навучы з глыбінь
Жывучую ваду рукою,
Каб наш народ і край любіць,
Мудрэць і харашэць душою.

# Дапамога калгасу



Восень-пара збору ўраджаю. Ураджай у гэтым годзе вырас багаты, асабліва бульбы. Некалі асноўная культура ва ўсіх сельгаспрадпрыемствах вырошчваецца сёння ў адзінкавых гаспадарках — гэтага дастаткова для задавальнення рыначных патрэб. Але тыя сельгасвытворцы, якія займаюцца «другім хлебам», на гэты раз не прагадалі: попыт на бульбу вырас як у Беларусі, так і на расійскім рынку.

Бульбяны палетак у СВК «Граўжышкі » размешчаны на 5 гектарах. Вырошчваннем працаёмкай культуры займаліся вопытныя бульбаводы гаспадаркі. Яны прафесійна рыхтавалі глебу, вялі пасадку, акучванне, хімпраполку — увесь цыкл «любімых» капрызнай бульбай работ. Садзяць гатункі, які зарэкамендавалі сябе высокай ураджайнасцю і добрымі спажывецкімі якасцямі.

Не абышлася гаспадарка без дапамогі вучняў нашай школы. Дзеці працавалі на калгасным полі цэлы тыдзень. Ураджай у гэтым годзе добры, таму дзеці працавалі з задавальненнем. Сёння нельга выдзеліць хто працаваў лепш, а хто горш. Усе, без выключэння, стараліся дапамагчы калгасу сабраць багаты ураджай. Гэта і атрымалася. За тыдзень палетак быў пусты. Дапамагалі вучням і настаўнікі, работнікі школы, дзіцячага сада. Калгас выдзеліў вучням школы на харчаванне 2 тоны бульбы.

***І.Гайдукевіч,вучань 7 класа***